View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Васіль СТАРЫЧОНАК

# “Я ВЕРШЫ ПІШУ, БО ДУЖА РАСТРЫВОЖАНЫ ЛЮБОЎЮ І БОЛЕМ ЗА КОЖНАГА З ВАС”: МЕТАФАРЫ Ў ТВОРАХ ПІМЕНА ПАНЧАНКІ

Вось ужо некалькі тысячагоддзяў метафара з’яўляецца своеасаблівым каменем спатыкнення ў філасофскай, літаратуразнаўчай, мовазнаўчай навуцы. Вучоныя з самых розных пазіцый падыходзяць да гэтага складанага моўнага феномену. Прызнаючы ці адмаўляючы такую рысу метафары, як магчымасць аб’ядноўваць, злучаць, знаходзіць адзінае ў розных прадметах і з’явах навакольнай рэчаіснасці, падкрэсліваючы ці закрэсліваючы яе здольнасць мастацкага “ўзвышэння” слова, увекавечвання аднастайнага, шэрага свету, практычна кожны пісьменнік (свядома ці несвядома) карыстаецца універсальным прыёмам метафарызацыі, гэтым унутраным рухавіком развіцця мовы. Не з’яўляецца выключэннем і народны пісьменнік Беларусі Пімен Панчанка, практычна ў кожным творы якога можна без цяжкасці адшукаць самыя розныя тыпы метафар. Праўда, сам аўтар не заўсёды прыязна ставіўся да гэтай семантычнай універсаліі. У дзённікавым запісе ад 6 верасня 1972 г. паэт называе метафару “жалкім падманам”, “антыментальным глупствам” і лічыць, што вобразны свет могуць прадстаўляць толькі высокія сімвалы і рэальная матэрыя: *“Метафар убогі зброд — “пацалунак слова”, “дакраніся да зоркі” — гэта жалкі падман, антыментальнае глупства. Толькі рэальная матэрыя і высокія сімвалы маюць права на існаванне. Гэта і ёсць вобразны свет, а мы займаемся яго падменай”.*[1] Не будзем лічыць гэта сцверджанне, зробленае хутчэй за ўсё пад уплывам хваробы і бальнічнага ложка, катэгарычным і безапеляцыйным. Уся творчасць паэта сведчыць пра адваротнае. П. Панчанка шырока выкарыстоўвае як рэальныя, так і патэнцыяльныя магчымасці семантыкі слова і яго кантэкставага спалучэння, стварае яркія, непаўторныя вобразы і метафары, прычым не заўсёды на базе існуючых і шырокавядомых мадэляў і формул.

Чалавеку, як сцвярджае народная мудрасць, трэба часцей глядзець на зоры, каб адчуць сябе часцінкай адзінага і вечна зменлівага Сусвету. Панчанаўскі позірк на неба метафарычны, бо суправаджаецца маральным падтэкстам, чалавечнасцю: *“Глядзіце знізу ўверх на сосны, На воблакі. Не на людзей”*. Лірычны герой многіх твораў *не здзіўляецца дзівіцца на* ***зорны***

[1] Панчанка П. Дзённікі // Полымя. — 1998, № 6. — С. 196.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*велічны* ***шацёр,*** *дзе плавае* ***маладзіковы човен,*** *на празрысты, лёгкі насціл, дзе вецер сіні* ***залаты гарох*** *рассыпаў трапяткіх, нямых* ***сузор'яў****, на Сонца, што* ***ніткі залацістыя*** *прадзе.*

Найбольш пашыранымі ў творчасці П. Панчанкі з'яўляюцца вонкава-падабенчыя метафары, заснаваныя на шырокім і мнагастайным спектры падабенстваў прадметаў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці: ***Башлыкі*** *адзелі ёлкі з снегу і стаяць сплючы*; *Вітаюць нас белымі* ***шапкамі*** *горы; І тады прыйшлі паважна хмары —* ***айсбергі*** *падсонечных* ***вышынь;*** *Быў адвячорак.* ***Воблакаў*** *стаялі* ***астравы*** *на небе;* ***Дажджу*** *густую* ***сетку*** *Накінуў вечар на муры*; *Сушаць вербы* ***пасмы*** *жоўтых* ***кос;*** *Агонь чырвонымі* ***клыкамі*** *Грызе разбіты Ваўкавыск; Узнялі два пражэктары Ў неба сівыя* ***мячы****.*

Сярод метафар гэтага тыпу вылучаюцца саматызмы (грэч. *soma, -atos* 'цела'), перанос у якіх ажыццяўляецца з найменняў частак цела чалавека і жывёлін на падобныя ў нечым прадметы. Параўн.: *Цяжкія* ***галовы*** *схіляюць Да самай зямлі каласы; Вясною на елчынах* ***лапах*** *адростваюць Светла-зялёныя пальцы; Дзьмухне вецер — і лісце клёнаў* ***Далонямі*** *цёмнымі стукне ў месяц; Каспійскаму мору расчэсвае* ***грыву*** *буран.* Назоўнікі *вока* і *бяльмо* ў паэта асацыіруюцца з ліхтаром і цыферблатам: *Санлівым* ***вокам*** *хмурыцца ліхтар; Сочыць рупліва* ***бяльмо цыферблата.***

У многіх выпадках у вонкава-падабенчых метафарах актуалізуецца сема 'многа, вялікая колькасць чаго-небудзь': *Вось тут каціўся грозны* ***вал людзей;*** *Асыпаецца ў шкляныя лужы З неба* ***зорак*** *рубінавы* ***град;*** ***Флатылія крыг*** *выходзіць на парад На цёмна-сінім вадзяным абрусе;* ***Елак табун*** *спіць пад белаю ватай.*

П. Панчанка ўдала выкарыстоўвае асацыяцыі з воднай стыхіяй, дзякуючы якім падкрэсліваецца імклівасць, плыннасць працякання чаго-небудзь: *І* ***вадаспады*** *залатога* ***зерня*** *Шумяць на ўсіх таках маёй зямл; І* ***ручаіны*** *цёплыя* ***зярнят*** *Ліюцца з ціхім шэлестам праз пальцы*; *Пілы гнуткія цярушаць* ***пілавіння*** *жоўты* ***дождж****.*

Квалітатыўныя (лац. *qualitas* 'якасць') метафары высвятляюць істотную пэўнасць, адметнасць прадмета, указваюць на яго характэрныя адзнакі, істотныя уласцівасці, прыметы, параўн.: ***лён*** *тваіх* ***валос, медзь*** *сонечных* ***праменняў****, росны* ***шоўк травы,*** *чорная* ***замш ночы***, ***зарыва калін.***

Анімістычных (грэч. *anima* 'душа', *animatio* 'адушаўлёнасць') метафар, арыентаваных на характарыстыку чалавека, у творах П. Панчанкі нямнога. З канатацыяй пагардлівасці ўжываецца метафара *лапух* у значэнні 'старамодны, адсталы чалавек': *Дачка — такое золатка, Жыве з калыскі соладка... Давай усё замежнае — Панчошкі і духі, На просценькіх з*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*насмешкаю Мармыча: “Лапухі”*. Семантычнай трансфармацыі часцей падвяргаюцца назвы людзей і міфічных істот: *Нас абавязвае эпоха Суняць **шаленцаў** лютых, Каб жыць і кроіць цёплы бохан Без атамнай атруты*; *Васіль Гайдук, цябе мы, **чорт**, усе... любілі ў прыфрантавой паласе*. Некаторыя зборныя назоўнікі не столькі трапна характарызуюць пэўныя групоўкі людзей, колькі з публіцыстычным запала выкрываюць іх сутнасць: *Ды толькі было яму наканавана Прабіцца ў **наменклатурнае кодла;** Хабарнік, злодзей даўно не ў пашане, Але працвітае шчэ **п’яніцаў каста***.

Крыніцай матывацыі для зоамарфізмаў у большасці выпадкаў з’яўляюцца заонімы (назвы жывёл) і арнітонімы (назвы птушак). Такія зоамарфізмы не столькі называюць чалавека, колькі вобразна, экспрэсіўна і ацэначна характарызуюць яго: *Па **драпежніку** б’юць трапяткія зенiткі; А можа, я сам — **дыназаўр** дапатопны — Не вартыя моладзі вершы пішу? У студэнтаў дзевак адбіваюць Тлустыя вучоныя **сычы***; *Ідзі, баец, ідзі, наш **сокал** ясны...*

Перанос у гукавых метафарах ажыццяўляюцца ў кірунку ад гукаў чалавека да падобных у нечым шуму ветру, дрэў, гулу грому і інш.: ***стогн** белых сцягоў над аркай; **трызненне** світальнай пары; **звон** трапяткіх таполяў; ад **ярасці** грому разрывы.*

Метафары псіхалагічнага тыпу звязаны з выяўленнем ўнутранага стану чалавека, яго псіхікі, асаблівасцей характару і духоўнага складу. У сваёй большасці яны актуалізуюць інварыянтныя значэнні ‘душэўны боль, пакута’, ‘моцны душэўны ўздым’: *Не ўратавацца ім! **Патопу** быць! **Патопу** гневу, ярасці; ўцякаў, нібы злачынца, З **пакутнай катаргі**, хутчэй, Каб адзінотаю лячыцца Ад варажбы тваіх вачэ; Лепш не пытай, чаму душа баліць — Я гэта **пекла** вызначыў сам.*

Адметнымі рысамі паэтычнага почырку П. Панчанкі з’яўляецца сплаў тонкага лірызму і палымянай публіцыстычнасці. У зборніках “Пры святле маланак”, “Снежань”, “Крык сойкі”, “Маўклівая малітва”, “І вера, і вернасць, і вечнасць”, “Горкі жолуд”, “Мы з тых беларусаў” і трывожны роздум над сутнасцю многіх з’яў і падзей, і клопат пра будучыню беларускай мовы, культуры, пра духоўнае ўзвышэнне чалавека, і гатоўнасць адгукнуцца на чужыя праблемы, прыняць на сябе чужы боль, і сцверджанне адвечнай прыгажосці жыцця, і крытыка прыстасавальніцтва, хлусні, кар’ерызму. Асабліва хвалююць творы аб сутнасці чалавека, яго духоўным складзе, яго адметнасці і непаўторнасці. Жыццёвы шлях традыцыйна асацыіруеццах з рознымі порамі года. Светлая пара жыцця, маладосць,– гэта вясна, сталая пара жыцця, старасць – зіма: *Хочацца зноўку сустрэцца З далёкай сваёй вясной; А мы са сваімі роднымі грахамі Самі дойдзем да сваёй зімы*. У вершы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Белыя яблыні” паэт  перадае веснавое шматгалоссе, “пялёсткаў шалёны хвалюючы пах”. Белая квецень яблынь — гэта абнаўленне  зямлі, прыроды, жыцця, гэта сімвал вечнай маладосці, радасць і шчасце першага кахання. Менавіта з расцвіўшых белых яблынь, на думку паэта, “нараджаюцца дзяўчаты на нашай зямлі”.

Аўтар выступае супраць няшчырасці, раўнадушша, мяшчанства і прыстасавальніцтва: *Які мізэрны і убогі Той недалёкі чалавек, Што цягне да сваёй* ***бярлогі*** *Набыткі розныя ўвесь век;* ***Змрок уласнасці*** *ахутаў Некаторым моцна вочы.* Ён з жалем зазначае, што самі людзі *“дружна падразаюць* ***жылы лесу,*** *траў і кветак топчуць карані, ад* ***зялёнай*** *адракаюцца* ***радні****”.*

Ён верыць у высокі маральна-этычны патэнцыял чалавека, заклікае бараніць праўду ад маны:

Праўда веку!
Зрабі нас дужымі,
Рабства знішчыць дапамажы:
Рабства жонкі і рабства мужа,
Рабства дачаў і аўтамашын...
(“*Сумленне*”)

П. Панчанка  часта выкарыстоўвае прыём нанізвання метафар, іх паслядоўнага разгортвання,  спалучэння у адным радзе метафар-назоўнікаў і эпітэтаў, што спрыяе стварэнню ёмістага сэнсава-зрокавы малюнка, узмацненню ўражання ад яго: *Праз* ***вір вятроў****, Праз* ***ярасць хваль касматых*** *Ляжыць іх [жураваоў] шлях, далёкі і цяжкі*; *Мы ведаем, хто Загнаў у* ***тупік*** *нашы справы, Сёння нас не* ***аслепіць Яркасць хлуслівага грыму;Завіруха чарэшын*** *мяне* ***Захапіла ў белы палон;*** Ужыванне у адным радзе кантрасных, часта -- процілеглых па сэнсе (антанімічных) метафар падкрэлівае абвостранасць, высокі напал сітуацыі, якая апісваецца: *Гэта ўжо не* ***світанне****, Гэта наша настала* ***змярканне****, Гэта з мовай маёй, Гэта з песняй маёй* ***развітанне; Душы*** *няўтольны* ***голад*** *надзеяй закілзай,* ***жыцця*** *свой горкі* ***жолуд*** *журботна дагрызай.*

Аб адметнасці панчанкаўскага почырка, асаблівасці паэта па-свойму ўспрымаць і ацэньваць рэчаіснасць сведчаць індывідуальна-аўтарскія метафары. Кірунак іх развіцця не заўсёды ўкладваецца ў межы дзеяння пэўных алгарытмаў, вядомых семантычных формул і мадэлей. Такія метафары па структуры, як правіла, двухчленныя, разгорнутыя. Іх значэнне найчасцей раскрываецца ў кантэкставай сітуацыі, дзе важную ролю адыгрывае характар спалучальнасці слоў (звычайна нестандартны) і семантычная напоўненасць кожнага слова: *Я бягу па* ***агрызках дарог;*** *Яго*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*душыць* ***каўнерык тугі;*** *Прайду па* ***сцежцы*** *цяжкіх* ***успамінаў****; На рыжай* ***скроні перавала*** *раўла...высокагорная рака; Той год адгарадзіў мяне сцяной ад* ***апекі*** *ўсемагутнай медзяной* ***капейкі;****. І дзікуну* ***далонямі газет*** *за акіянам плешча дрэсіроўшчык.*

У творах П. Панчанкі, як пры святле маланак, кантрасна высвечваецца ўся глыбіня складанага чалавечага жыцця, трывога за лёс людзей і планеты:

Такі наш век: не падай у знямозе!
Жыві між бур, маланак і трывог.
Ў дарозе я, а ўжо ў маім абозе
Тры тысячы маткоў зямных дарог.

Паэзію П. Панчанкі, сатканую са слоў у прамым і пераносным значэннях, у звычайных і незвычайных кантэкставых сітуацыях, можна назваць "мужнай, сумленнай, даверлівай, спагадлівай, непрымірымай, бескампраміснай, страснай, эмацыянальнай, філасофскай". У ёй адчуваецца барацьба за "ісціны простыя, як хлеб, і праўдзівыя, як плач дзіцяці", за чалавечнасць і такую дабрату, якая "ў будучыню сэрцы кіруе і ажыўляе слых у глухіх". Творы народнага паэта ўзвышаюць, дапамагаюць жыць, думаць і марыць, сцвярджаюць цудоўныя каштоўнасці чалавечага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ